**ТВОРЧАСЦЬ ЗЕМЛЯКОЎ**

# Яшчэ не ўсё сабрана з нівы...

**Здавён сачу за творчасцю Галіны Рагавой, з якой калісь пазнаёміліся на пасяджэнні літаб'яднання "Пралеска" ў Гомельскім раёне.**

Найперш уразіла яе цудоўная беларуская мова. Аказалася: невыпадкова. Галіна Аляксандраўна скончыла школу, у якой усе прадметы выкладаліся па-беларуску. І што не менш важна, жыве ў адпаведным моўным асяродку. Прынамсі, яна цудоўна апавядае пра гэта ў вершы "Чаму пішу пабеларуску".

У Гомельскую цэнтральную гарадскую бібліятэку імя А. І. Герцэна на творчы вечар ветэрана-педагога Галіны Рагавой прыйшло столькі прыхільнікаў яе творчасці, што і яблыку не было дзе ўпасці. І гэта лепшае пацвярджэнне моцы таленту, яго сапраўднасці. Вядучыя літаратурнага салона "Сустрэчы на Замкавай" арганізавалі вечарыну ў імправізаваным класе, а тэмай урокаў пазначылі — "Папараць-кветка".

І сапраўды, бы папараць-кветка, вырас, расцвіў, набраўся моцы талент нашай зямлячкі, аўтаркі трох паэтычных кніг "Роздум", "Залатыя сходні", "Час перад святам".

Галіна Аляксандраўна — дбайная працаўніца. Ва ўсім. І таму ў яе зборніках няма вершаў выпадковых, прахадных. Яна пільна працуе над кожным словам. І што не менш важна, вельмі сціплы чалавек.

Багацце думак, глыбіню пачуццяў, цудоўную мову Галіны Рагавой адзначыла выдавец Міла Беразоўская, яе цудоўныя рыфмы, разнастайныя дынамічныя рытмы.

Шчыра, пранікнёна гаварылі пра творчасць Галіны Рагавой многія творцы, настаўнікі школ Гомельскага раёна, старшыня Гомельскай раённай арганізацыі ветэранаў працы галіны адукацыі і прафсаюзнага руху Галіна Мендзелева. Паэт, член савета абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі Міхась Болсун, бы падсумоўваючы сказанае, зазначыў, што ва ўсіх кнігах Галіны Рагавой можна знайсці залацінкі-вобразы, і ўручыў ёй рэкамендацыю на ўступленне ў Саюз пісьменнікаў Беларусі.

Вельмі кранаючым момантам вечарыны было віншаванне паэтэсы яе дочкамі. А іх у Галіны Аляксандраўны — тры! Букеты ўручылі не толькі яны, але і ўнукі, якія вырастаюць на вершах любай бабулі. Дай жа лёс вам, шаноўная Галіна Аляксандраўна, "далашчыць, наглядзецца, далюбіць".

**Тамара КРУЧЭНКА**



ФОТА АЛЕГА БЕЛАВУСАВА

**Галіна Рагавая**